WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

7 КАСТРЫЧНІКА 2011 г.
ПЯТНІЦА
№ 192
(27056)

Кошт 800 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА 7 КАСТРЫЧНІКА ДАСЦЬ ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЮ ДЛЯ ПРАДСТАЎНІКОЎ РАСІЙСКІХ СМІ

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 7 кастрычніка дасць прэс-канферэнцыю для ўдзельнікаў прэс-тура прадстаўнікоў расійскіх СМІ ў Беларусь.

У 10.45 Першы нацыянальны канал Беларускага радыё пачне прамое ўключэнне з залы Нацыянальнай бібліятэкі, дзе будзе праходзіць сустрэча Прэзідэнта з журналістамі. У вячэрнім тэлеэфіры Першага нацыянальнага тэлеканала, а таксама каналаў АНТ і СТБ будзе паказана тэлеверсія прэс-канферэнцыі. У гэтым, дзявятым па ліку прэс-туры, які праходзіць з 4 па 7 кастрычніка, удзельнічаюць 86 журналістаў з чатырох дзясяткаў суб'ектаў Расійскай Федэрацыі. Яны прадстаўляюць 74 СМІ (53 рэгіянальныя, 17 федэральных, 4 саюзныя). У праграме прэс-тура — наведванне аб'ектаў прамысловасці, сельскай гаспадаркі, сацыяльнай сферы, абароны ў Гомельскай і Мінскай абласцях.

НАЦБАНК КАНСТАТУЕ СТАБІЛІЗАЦЫЮ СІТУАЦЫІ НА ВАЛЮТНЫМ РЫНКУ БЕЛАРУСІ

Аб гэтым Прэзідэнту краіны Аляксандру Лукашэнку 6 кастрычніка далажыла старшыня праўлення Нацбанка Надзея Ермакова.

У цэлым сітуацыя застаецца стабільнай. «Дадатковая сесія Беларускай валютна-фондавай біржы працуе, працуе наяўны рынак. Якіх-небудзь перашкод або затрымак, у прынцыпе, няма. Адзінае, хацелася б, каб на рынак ішло больш прапаноў, а пакуль прадпрыемствы ўсё ж такі асцярожнічаюць», — сказала старшыня праўлення Нацбанка.

Надзея Ермакова адзначыла, што не аказваецца якога-небудзь адміністрацыйнага націску або рэгулявання з боку Нацыянальнага банка на пазабіржавы рынак. Курс беларускага рубля ўстанаўліваецца рыначнымі механізмамі, змяняючыся нязначна. Для ўстанаўлення стабільнага курсу беларускага рубля, лічыць Нацбанк, патрэбны пэўны час. Ад далейшага попыту і прапанавання на валюту будзе залежаць і тое, калі адновіцца адзіны афіцыйны курс. Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў ад Нацыянальнага банка безумоўна забяспечыць выкананне задач, якія былі пастаўлены на нарадзе ў канцы жніўня па актуальных пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

З 1 СТУДЗЕНЯ 2012 ГОДА СЛЕДЧЫ КАМІТЭТ ПАЧНЕ ФУНКЦЫЯНАВАЦЬ У ПОЎНЫМ АБ'ЁМЕ

Дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Леанід Мальцаў 6 кастрычніка праінфармаваў Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнку аб ходзе стварэння Следчага камітэта.

У прыватнасці, цяпер распрацоўваецца палажэнне аб Следчым камітэце, адпрацоўваецца механізм яго ўзаемадзеяння з пракуратурай, органамі ўнутраных спраў, Камітэтам дзяржаўнага кантролю і іншымі дзяржорганамі. Рыхтуюцца адпаведныя змяненні і папраўкі ў законы, Крымінальна-працэсуальны кодэкс. Паводле слоў Леаніда Мальцава, гэта работа ідзе па плане, і з 1 студзеня 2012 года Следчы камітэт пачне функцыянаваць у поўным аб'ёме, што дасць магчымасць павысіць прававую абароненасць жыхароў краіны, як таго патрабуе Прэзідэнт.

ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ ПАВІНШАВАЎ РАБОТНІКАЎ БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ЧЫРВОНАГА КРЫЖА З 90-ГОДДЗЕМ АБ'ЯДНАННЯ

Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, гэта старэйшая гуманітарная арганізацыя карыстаецца ў нашай краіне вялікім аўтарытэтам дзякуючы сваёй нястомнай рабоце па аказанні падтрымкі людзям, якія маюць патрэбу ў клопаце. Аляксандр Лукашэнка пажадаў усім работнікам і членам таварыства здароўя, шчасця і новых поспехаў у высакароднай справе ўмацавання міласэрнасці і чалавекалюбства.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ УЛАДЗІМІРА ПУЦІНА З ДНЁМ НАРАДЖЭННЯ

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Старшыню Урада Расійскай Федэрацыі Уладзіміра Пуціна з днём нараджэння.

«З задавальненнем адзначаю партнёрскі характар дыялогу, што склаўся за многія гады супрацоўніцтва і садзейнічае аб'яднанню намаганняў па развіцці інтэграцыйных працэсаў паміж нашымі краінамі», — гаворыцца ў віншаванні. Аляксандр Лукашэнка пажадаў Уладзіміру Пуціну моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту і поспехаў у яго адказнай дзейнасці.

КІРАЎНІК ДЗЯРЖАВЫ ВЫЗВАЛІЎ ВАСІЛЯ МАНЮКА АД ПАСАДЫ НАМЕСНІКА СТАРШЫНІ БЕЛТЭЛЕРАДЫЁКАМПАНІІ

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 6 кастрычніка падпісаў указ, у адпаведнасці з якім Васіль Манюк вызвалены ад пасады намесніка старшыні Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ТРАФЕІ «ЗУБАСТАГА» ВОЗЕРА

Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

КОЛЬКІ ШЧУПАКУ не плаваць... Але ўсё роўна рана ці позна ён патрапіць у трафейную калекцыю Сяргея Пагарэльскага. Асабліва, калі рыбіна дасягне дзесяці і болей кілаграмаў. Нядаўна гэтаму жыхару вёскі Бярозкі трапіў на кручок 12-кілаграмовы шчупак. Сяргей прынцыпова ловіць толькі ў сваім — Бярозаўскім возеры, на беразе якога вырас і жыве цяпер. Шчупаковыя і судаковыя чучалы-сківіцы, зробленыя рукамі самога рыбалова, хоць і выглядаюць даволі агрэсіўна, іх, тым не менш, можна ўбачыць на сталічных і абласных выстаўках рыбалоўства, палявання і турызму.

ВАЛЮТЫ «ПАСКАКАЛІ»?

Пасля чарговай дадатковай сесіі на Беларускай валютна-фондавай біржы долар падаражэў на 200 рублёў, еўра — на 180, а расійскі рубель — на 7.

Часовае падаражэнне валют прагназавалася экспертамі, але наколькі яно будзе вялікім — пакажа час.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

РЫНКАВЫЯ КУРСЫ НА 6 КАСТРЫЧНІКА:

Долар ЗША — 7810 беларускіх рублёў;
Еўра — 10600 беларускіх рублёў;
Расійскі рубель — 246 беларускіх рублёў.

КУРСЫ НЕКАТОРЫХ БАНКАЎ НА 6 КАСТРЫЧНІКА:

«Беларусбанк»: долар ЗША — 7770 і 8000; еўра — 10350 і 10800; расійскі рубель — 238 і 249.
«Беларускі народны банк»: долар ЗША — 7600 і 7900; еўра — 10000 і 10560; расійскі рубель — 230 і 250.
«Трастбанк»: долар ЗША — 7690 і 7950; еўра — 10200 і 10700; расійскі рубель — 225 і 250.

НЕЗАКОННЫ ДАХОД ЗЛАЧЫННАЙ ГРУПЫ ПЕРАВЫСІЎ 17 МІЛЬЯРДАЎ РУБЛЁЎ

Дэпартамент фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю завёў крымінальную справу за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць у дачыненні да грамадзян нашай краіны, што дзейнічалі ў складзе арганізаванай злачыннай групы. Яны ажыццяўлялі незаконныя фінансавыя аперацыі па пераводзе безнаяўных беларускіх рублёў у наяўную замежную валюту і наадварот.

Як паведамілі ў сектары па працы са СМІ Дзяржкантролю, выкарыстоўваючы рэквізіты, пячаткі і разліковыя рахункі падкантрольных ілжэпрадпрымальніцкіх структур, арганізатары і актыўныя ўдзельнікі злачыннай групы аказвалі паслугі суб'ектам гаспадарання, якім трэба было ўвесці ў легальнае абарачэнне тавар, набыты за наяўны разлік або вывесці з легальнага абарачэння рэалізаваную за наяўныя грошы прадукцыю. Каб надаць законнасць гэтым аперацыям, злачынная група забяспечвала суб'ектаў гаспадарання фальшывымі бухгалтарскімі дакументамі.

Злачынцаў затрымалі ў сталіцы на здымнай кватэры, дзе размяшчаўся офіс гэтай групы і дзе рыхтаваліся фіктыўныя дакументы, праводзіліся сустрэчы з кліентамі. Арганізаваная група дзейнічала на працягу двух гадоў. За гэты час яе ўдзельнікі атрымалі незаконны даход на суму больш за 17 мільярдаў рублёў. Падчас вобыскаў былі канфіскаваны наяўныя грашовыя сродкі ўдзельнікаў злачыннай групы, быў накладзены арышт на пяць дарагіх аўтамабіляў, на рахунках ілжэпрадпрымальніцкіх структур арыштавана больш за 140 мільёнаў рублёў. Тры ўдзельнікі злачыннай групы знаходзяцца пад вартай.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДЖЭМПЕРЫ І КУРТКІ ЗАМЕСТ ШПРОТАЎ — НА Br10 МІЛЬЯРДАЎ

Супрацоўнікі Віцебскай мытні на беларуска-латвійскім участку мяжы знайшлі ў грузавіку буйную партыю кантрабанднага адзення.

На памежным пункце пропуску «Урбаны» ў грузавіку, які накіроўваўся з Латвіі ва Украіну транзітам праз Беларусь, мытнікі ў грузавым адсеку паўпрычэпа знайшлі больш за 10 тысяч курток і звыш 6 тысяч жаночых джэмпераў замежнай вытворчасці агульным коштам 10 мільярдаў рублёў. І гэта толькі па папярэдніх ацэнках. Цікава, што вадзіцель, наш суграмадзянін, перад тым, як знайшлі кантрабанду, паказаў мытнікам суправаджальныя дакументы на груз, у якіх адзначалася, што ён вязе на заказ украінскай фірмы шпроты ў алей. Адзенне канфіскавалі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

Мікалаю Ладуцьку аб'яўлена заўвага за валакіту і бюракратызм пры арганізацыі работы з інвестарамі

Распараджэннем кіраўніка дзяржавы 6 кастрычніка старшыні Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Мікалаю Ладуцьку аб'яўлена заўвага за непрыняцце належных мер па арганізацыі работы з інвестарамі, валакіту і бюракратызм.

На нарадзе 29 верасня па рэалізацыі ў Мінску інвестыцыйных праектаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка раскрытыкаваў сталічныя ўлады за валакіту і бюракратызм у рабоце з інвестарамі. Кіраўніцтвам горада таксама прыняты рашэнні па прыцягненні да адказнасці вінаватых. У прыватнасці, вызвалены ад займаемых пасад старшыня камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва Віктар Нікіцін і яго першы намеснік Аляксей Мартынаў, начальнік управлення архітэктуры і арганізацыі праектных работ камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва Ф.І. Жураўлёў і сакратар старшыні камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва Е.Л. Валковіч. Акрамя таго, панеслі адпаведнае пакаранне намеснік старшыні Мінгарвыканкама Сяргей Радаман і начальнік управлення арганізацыйна-кадравай работы Мінгарвыканкама У.І. Зубрык.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ІСПАНСКАЯ СУПРАЦЬРАКЕТНАЯ НЕСПАДЗЕЎКА НАТА АБУРЫЛА РАСІЮ



Міністэрства замежных спраў РФ, каментуючы паведамленне пра далучэнне Іспаніі да стварэння сістэмы амерыканскай проціракетнай абароны (ПРА) у Еўропе, выказала сур'ёзную заклапочанасць гэтай дамоўленасцю Вашынгтона і Мадрыда. Як паведаміў напярэдадні іспанскі прэм'ер-міністр Хасэ Луіс Радрыгес Сапатэра, чатыры амерыканскія караблі, абсталяваныя шматмэтавым зенітна-ракетным комплексам Aegis і супрацьракетамі SM-3, будуць змешчаны з 2013 года на базе ВМС ЗША на поўдні Іспаніі.

«Чарговы крок ЗША па рэалізацыі «фазаванага адаптыўнага падыходу» да пабудовы ПРА ў Еўропе не можа не насцярожваць, паколькі ўжо на першай фазе яго рэалізацыі адбываецца істотнае нарошчванне супрацьракетнага патэнцыялу ЗША ў еўрапейскай зоне», — гаворыцца ў заяве МЗС РФ, апублікаванай на сайце ведамства ў чацвер.

Як адзначаецца ў каментары замежнапалітычнага ведамства, расійскі бок лічыць «непрымальнай амерыканскую практыку «фактаў, якія адбыліся», у пытаннях супрацьракетнага ўладкавання Еўропы, калі без калектыўнага абмеркавання, без уліку меркавання ўсіх зацікаўленых краін прымаюцца рашэнні, здольныя паўплываць на стан бяспекі і стабільнасці ў Еўраатлантыцы».

Дыпламатычнае ведамства канстатавала, што Масква не толькі не бачыць гатоўнасці адміністрацыі пайсці насустрач «расійскай заклапочанасці» ў ключавым для РФ пытанні пра юрыдычныя гарантыі ненакіраванасці будучай сістэмы ПРА супраць расійскіх сродкаў стратэгічных ядзерных сіл, але, наадварот, фіксуе імкненне «ўсё больш пашырае раёны разгортвання супрацьракетных сродкаў ЗША».

МАЎРОДЗІ З НОВЫМ «МММ» АТАКАВАЎ УКРАІНУ: КОЛЬКАСЦЬ УКЛАДЧЫКАЎ — СОТНІ ТЫСЯЧ

Заснавальнік скандальна вядомай фінансавай піраміды «МММ» Сяргей Маўродзі, узяўшыся за старое, развіў бурную дзейнасць ва Украіне. З пачатку верасня ў Кіеве з'явіліся рэкламныя білборды. Каардынаты фінансавай піраміды змешчаны ў цягніках метро, на прыпынках грамадскага транспарту і нават на асфальце. Органы валютнага кантролю паспрабавалі забараніць дзейнасць «МММ», але сутыкнуліся з недасканаласцю заканадаўства, піша «Незалежная газета».

Маўродзі характарызуе сваё новае стварэнне як «глабальную касу ўзаемадапамогі» і «структураваную фінансавую сацыяльную сетку»: усе плацяжы праводзяцца ў электронным выглядзе без удзелу юрасобы-арганізатара. Людзі купляюць і прадаюць валюту па ўмоўным курсе.

«У «МММ» няма юрыдычнай асобы: ні офіса, ні банкаўскага рахунку. Людзі проста перакладаюць грошы адно аднаму — без якіх-небудзь умоў, гарантый, абяцанняў», — растлумачыў Маўродзі ўкраінскім СМІ прынцып працы новай піраміды. Ён пацвердзіў інфармацыю пра тое, што колькасць арміі новых укладчыкаў складае сотні тысяч чалавек.

Дзяржаўная камісія па рэгуляванні рынкаў фінансавых паслуг раней заявіла, што дзейнасць фінансавай піраміды Маўродзі, якая вядзецца ва Украіне, незаконная. «Інфармацыя пра юрыдычную асобу, найменне якой «МММ-2011», у Дзяржаўны рэестр фінансавых устаноў не ўносілася, статусу фінансавай установы такая асоба не набывала, адпаведныя ліцэнзій не атрымлівала», — гаварылася ў паведамленні камісіі, апублікаваным у верасні на сайце «Украінскія навіны».

Дэпутат Вярхоўнай Рады ад Партыі рэгіёнаў, член парламенцкага камітэта па пытаннях фінансаў і банкаўскай дзейнасці Васіль Горбаль назваў дзве прычыны папулярнасці піраміды: «Высокія прыбыткі і рэклама. Тэлебачанне, запрашаючы Маўродзі ў ток-шоу, тым самым рэкламуе яго піраміду. Ён з тэлеэкрана прапануе грамадзянам касмічны курс валют, прыбыткі ў 20-30%. І, як у любой краіне свету, ва Украіне ёсць людзі, якія захоўваюць грошы пад падушкай, якія пападаюцца на гэтую прынаду».

Эканамісты ўпэўнены, што чыннік не толькі ў наіўнасці і даверлівасці грамадзян, але ў першую чаргу — у спробе захаваць і засцерагчы свае зберажэнні. Сумняваючыся ў стабільнасці валюты, украінцы сталі мяняць грыўні на долары і еўра.

Нагадаем, першая піраміда «МММ», якая была створана Маўродзі ў 90-х гадах і стала найбуйнейшай у гісторыі краіны, абанкруціла мільёны расіян. У сувязі з гэтым у 2003 годзе ён быў асуджаны да 13 месяцаў пазбаўлення волі, а ў красавіку 2007 года атрымаў яшчэ адзін тэрмін — чатыры з паловай года.

КАНТРАБАНДНЫ «ПРЭМ'ЕР»

Супрацоўнікі Віцебскай мытні сумесна з супрацоўнікамі КДБ на чыгуначным пункце пропуску «Бігосава» выявілі буйную кантрабандную партыю цыгарэт «Прэм'ер» беларускай вытворчасці агульным коштам звыш 172,2 мільёна рублёў. 65 тысяч пачак цыгарэт схавалі ў каробках у трох паўвагонах пад вугалем. Чыгуначны састаў накіроўваўся па маршруце «Полацк — Даўгаўпілс». Праводзіцца расследаванне.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЗАКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО
Цептер Банк

ЗАО «ЦЕПТЕР БАНК»
Адрес: 220034, г. Минск, ул. Платонова, 1Б
эл. адрес: info@zepterbank.by.
Тел. 331 89 49, факс 331 89 48

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2011 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.10.2011	01.10.2010
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	10 909,5	1 498,0
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	25 901,8	2 417,0
5	Средства в банках	1104	107 568,1	9 030,1
6	Ценные бумаги	1105	19 684,4	18 049,9
7	Кредиты клиентам	1106	138 449,9	66 265,9
8	Производные финансовые активы	1107	-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	-	-
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	10 802,9	8 683,6
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110	-	-
12	Прочие активы	1111	2 009,5	2 377,0
13	ИТОГО активы	11	315 326,1	108 321,5
14	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
15	Средства Национального банка	1201	7 586,7	-
16	Средства банков	1202	19 128,1	7 575,4
17	Средства клиентов	1203	109 590,4	27 875,2
18	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204	-	18 622,2
19	Производные финансовые обязательства	1205	-	-
20	Прочие обязательства	1206	2 460,3	943,8
21	ВСЕГО обязательства	120	138 765,5	55 016,6
22	**КАПИТАЛ**			
23	Уставный фонд	1211	149 487,0	42 030,0
24	Эмиссионный доход	1212	-	-
25	Резервный фонд	1213	2 101,5	2 101,5
26	Фонд переоценки статей баланса	1214	1 306,3	37,0
27	Накопленная прибыль	1215	23 665,8	9 136,4
28	ВСЕГО капитал	121	176 560,6	53 304,9
29	ИТОГО обязательства и капитал	12	315 326,1	108 321,5

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ с 1 января 2011 г. по 30 сентября 2011 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.01.2011-30.09.2011	01.01.2010-30.09.2010
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	16 225,6	9 005,4
2	Процентные расходы	2012	4 773,8	1 663,4
3	Чистые процентные доходы	201	11 451,8	7 342,0
4	Комиссионные доходы	2021	2 930,4	834,0
5	Комиссионные расходы	2022	921,1	124,1
6	Чистые комиссионные доходы	202	2 009,3	709,9
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	14,1	12,2
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	23 911,1	959,0
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	-	-
11	Чистые отчисления в резервы	207	10 837,6	421,0
12	Прочие доходы	208	146,1	90,4
13	Операционные расходы	209	8 768,3	5 851,4
14	Прочие расходы	210	2 571,5	431,9
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	15 355,0	2 409,2
16	Налог на прибыль	212	1 239,9	329,1
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	14 115,1	2 080,1

Председатель Правления **Дворников Игорь Андреевич**
Главный бухгалтер **Нестерова Галина Чеславовна**
Дата подписания «06» октября 2011 г.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь от 13 ноября 2008 года № 31 на осуществление банковской деятельности. УНП 807000214, БИК 153001820.

Генпракуратура Беларусі:

ПРАВЯДЗЕННЕ «НАРОДНАГА СХОДУ» НЕ САНКЦЫЯНАВАНАЕ

Правядзенне масавых мерапрыемстваў пад назвай «Народны сход» не санкцыянаванае. Пра гэта заявіў учора журналістам начальнік управлення па наглядзе за выкананнем заканадаўства і законнасцю прававых актаў Генеральнай пракуратуры Павел Радзівонаў, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Паводле слоў Паўла Радзівонава, арганізатары акцыі папярэджаны аб недапушчальнасці парушэння заканадаўства. Ім таксама растлумачана, што ў выпадку парушэння дзейных нормаў закона «Аб масавых мерапрыемствах» яны могуць быць прыцягнуты да адказнасці.

«Генеральная пракуратура таксама звяртаецца да грамадзян Рэспублікі Беларусь не паддавацца на правакацыйныя заклікі і не ўдзельнічаць у тых мерапрыемствах, якія супярэчаць нормам дзейнага заканадаўства. Гэты заклік абумоўлены імкненнем забяспечыць грамадскую бяспеку, нармальнае функцыянаванне грамадскіх, грамадзянскіх інстытутаў», — адзначыў Павел Радзівонаў.

Пачынаючы з ліпеня гэтага года, у інтэрнэце актыўна анансуецца правядзенне так званага «Народнага сходу». Па задуме арганізатараў, на вуліцы гарадоў краіны павінны выйсці дзясяткі тысяч беларусаў. Учора ў Генеральнай пракуратуры адбылася гутарка з ініцыятарамі акцыі В. Івашкевічам і Г.Федынічам, дзе ім растлумачана, што нормы Закона «Аб мясцовых і рэспубліканскіх сходах» на так званы «Народны сход» не распаўсюджваюцца. Як растлумачыў Павел Радзівонаў, для ініцыяцыі правядзення такога сходу неабходна 10% подпісаў насельніцтва, якое пражывае на дадзенай тэрыторыі, а арганізатарамі акцыі, у прыватнасці ў Мінску, сабраны толькі подпісы жыхароў некалькіх пад'ездаў дамоў у мікрараёне Серабранка і дамоў, прылеглых да плошчы Бангалор.

«Цалкам відавочна, што некалькі сотняў подпісаў, сабраных у асобных пад'ездах дамоў, прылеглых да плошчы Бангалор, і некалькіх дамоў у раёне Серабранкі, недастаткова для абмеркавання пытанняў жыцця грамадства і дзяржавы», — сказаў Павел Радзівонаў.

Генпракуратура прыйшла да высновы, што правядзенне падобных «сходаў» рэгламентуецца Законам «Аб масавых мерапрыемствах». Арганізатары такіх масавых мерапрыемстваў не атрымалі адпаведных дазволаў на іх правядзенне ад мясцовых органаў улады. «Улічваючы гэтыя акалічнасці, арганізацыя і правядзенне масавых мерапрыемстваў пад назвай «Народны сход» з'яўляецца несанкцыянаваным. Мы з павагай ставімся да права грамадзян на правядзенне сходаў, але ігнаруем нормы права і маніпуляванць нормамі права лічым недазвольным», — сказаў Павел Радзівонаў.

БРСМ і РГА «Белая Русь» адыгрываюць важную ролю ў фарміраванні кіраўнічых кадраў

Пра гэта ўчора на брэсцкім абласным адукацыйным форуме для асоб, уключаных у перспектыўны кадравы рэзерв, заявіў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандр Радзькоў, перадае БЕЛТА.

«БРСМ мы разглядаем як правапераемніка камсамола. Гэты досвед губляць нельга, неабходна захоўваць яго станоўчыя традыцыі, не прывязваючыся да таго, што ён камуністычны ці камсамольскі...» Паводле яго слоў, фарміраванне перспектыўнага кадравага рэзерву — няпростая задача. Перш за ўсё, важна, каб чалавек зарэкамендаваў сябе як высакакласны спецыяліст у сваёй сферы, заслужыў павагу калег. Пры гэтым маладым людзям, якія нацэльваюць сябе на дзяржслужбу, неабходна даць магчымасць праявіць сябе ў гаспадарчай, ідэалагічнай або палітычнай сферах, атрымаць досвед арганізацыйнай, прапагандысцкай працы. А гэта значыць, што яны павінны быць у сістэме моладзевай арганізацыі, грамадскім аб'яднанні, партыі. «Такія прынцыпы ўладкавання грамадства ва ўсім свеце, гэта так і ў нас. Але мы павінны ўладкоўваць наша грамадства ў адпаведнасці з нашымі традыцыямі, асаблівасцямі».

Абмяжоўваць доступ у інтэрнэт не будуць

«Закрываць інтэрнэт, абмяжоўваць доступ да інтэрнэт-рэсурсаў няма ніякай неабходнасці. Інтэрнэт — гэта новая культура сучаснага грамадства, якая нясе ў сабе шмат важнага і каштоўнага», — адзначыў Аляксандр Радзькоў. У той жа час у сябе ў краіне мы павінны выхоўваць культуру карыстання інтэрнэтам. «Гэта вельмі складана. Але мы павінны прыйсці да разумення таго, што на працоўным месцы інтэрнэт не павінен адцягваць ад працы, карыстанне інтэрнэтам павінна быць абмежавана тымі задачамі, якія вырашае канкрэтны спецыяліст, або ва ўстанове адукацыі прадугледжвае адукацыйны працэс. У дадзеным выпадку мы элементарна павінны навучыцца лічыць нашы грошы і не дапускаць злоўжыванняў. Пры гэтым дома карыстальніку інтэрнэту павінны быць прадастаўлены ўсе магчымасці гэтага рэсурсу». Інтэрнэт неабходна больш шырока выкарыстоўваць у сферы распаўсюджвання дзяржаўнай ідэалогіі, нацыянальнай культуры...

Супрацоўнік ААТ «Шклозавод «Нёман» затрыманы пры атрыманні хабару

Упраўленне КДБ Рэспублікі Беларусь па Гродзенскай вобласці спыніла карупцыйную дзейнасць службовай асобы ААТ «Шклозавод «Нёман», паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе УКДБ. За ўзнагароджанне ў памеры Br70 млн спецыяліст шклозавода пры закупцы абсталявання лабіраваў інтарэсы аднаго з прадпрыемстваў Гомеля. Яго проціпраўныя дзеянні былі задакументаваны ў выніку прынятых сумесных аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў упраўленняў КДБ па Гродзенскай і Гомельскай абласцях. Службовая асоба была затрымана каля адміністрацыйнага будынка шклозавода з доказамі злачынства ў момант атрымання першай часткі хабару ў памеры Br35 млн.

Затрыманаму прад'яўлена абвінавачанне ў атрыманні хабару ў асабліва буйным памеры. За гэта прадугледжана пазбаўленне волі тэрмінам да 15 гадоў з канфіскацыяй маёмасці і пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 7.10.2011 г. (для б/н разлікаў)		Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрбанк РФ	
▲1 долар ЗША	5 758,00	1 чэшская крона	312,15
▲1 еўра	7 676,57	1 польскі злоты	1 759,05
1 латвійскі лат	10 863,13	▲1 расійскі рубель	177,12
1 літоўскі літ	2 230,18	1 украінская грыўня	719,48
USD	32,5085		
10 UAH	40,5849		
10000 BYR	56,5365		
EUR	43,3728		

Атэстата ўладальніка пакладзена

РЭПЕТЫЦЫЙНАЕ ТЭСЦІРАВАННЕ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Па словах Мікалая Фяськова, з кожным годам іх інстытут атрымлівае ад абітурыентаў усё менш скаргаў рознага кшталту, але сёлета павялічылася колькасць незадаволеных тым, што іх вынік на цэнтралізаваным тэсціраванні аказаўся намнога ніжэйшы, чым падчас рэпетыцыі будучага экзамену. Напрыклад, падчас рэпетыцыйнага тэсціравання ў абітурыента было 80 балаў, а падчас ЦТ — толькі 32. Калі ў Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў сталі аналізаваць прычыны, то высветлілася, што не ва ўсіх пунктах правядзення рэпетыцыйнага тэсціравання строга вытрымлівалася вызначаная працэдура: патэнцыйныя абітурыенты маглі праносіць падручнікі, шпаргалкі, карыстацца падказкамі, не здаваць мабільны тэлефон. Таму цяпер працэдура правядзення рэпетыцыйнага тэсціравання нічым не будзе адрознівацца ад цэнтралізаванага тэсціравання. Арганізатары «рэпетыцыі» павінны будуць прытрымлівацца ўсіх правіл правядзення ЦТ, каб адразу настроіць абітурыентаў на сур'ёзны лад і змадэляваць рэальную псіхалагічную абстаноўку правядзення ЦТ: ніякіх мабільнікаў, дапаможнікаў і шпаргалак у экзаменацыйнай аўдыторыі! Арганізатарам дазваляецца канструяваць удзельнікаў «рэпетыцыі» толькі па тэхналогіі работы над тэстам і па парадку запаўнення бланка, але ніякіх кансультацый па змесце тэстаў не дапускаецца. У адрозненне ад ЦТ, пасля рэпетыцыйнага тэсціравання яго ўдзельнікам дазваляецца забіраць чарнавік дамоў. Колькасць дысцыплін, якія можна здаваць на рэпетыцыйным тэсціраванні, у адрозненне ад ЦТ, ніхто не абмяжоўвае. Больш за тое, можна паспрабаваць здаць кожную дысцыпліну нават двойчы, паколькі для кожнага рэпетыцыйнага тура рыхтуюцца два варыянты тэстаў. Таксама да ўдзелу ў рэпетыцыйным тэсціраванні дапускаюцца і дзесяцікласнікі...

Арганізатары «рэпетыцыі» павінны будуць прытрымлівацца ўсіх правіл правядзення ЦТ, каб адразу настроіць абітурыентаў на сур'ёзны лад і змадэляваць рэальную псіхалагічную абстаноўку правядзення ЦТ: ніякіх мабільнікаў, дапаможнікаў і шпаргалак у экзаменацыйнай аўдыторыі!

Мікалай Фяськоў дадаў, што арганізатары ЦТ і далей будуць перапраўляць усе работы ўдзельнікаў як цэнтралізаванага, так і рэпетыцыйнага тэсціравання, якія маюць нулявы вынік. Хоць дагэтуль не было ніводнага выпадку, каб нулявы бал быў выстаўлены абітурыенту выпадкова ці памылкова.

— Калі абітурыент здае арганізатарам у аўдыторыі проста чысты бланк, нават не спрабуючы прыступіць да выканання заданняў — гэта адна справа, і зусім іншая — калі мы бачым, што на 18 заданняў з вобласці А абітурыент спрабаваў даць адказ. Прычым абітурыент яўна не варажыў на кававай гушчы, што відаць па яго чарнавіку, але ніводнага правільнага адказу дадзена не было. Крыўдна, аднак нічым дапамагчы яму мы не можам, — мусіў канстатаваць Мікалай Фяськоў.

Як вядома, Дзяржаўная камісія па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзеннем уступных іспытаў унесла па выніках прыёмнай кампаніі прапанову аб павелічэнні часу на правядзенне цэнтралізаванага тэсціравання па некаторых дысцыплінах. У прыватнасці, згадвалася ЦТ па фізіцы, па выніках якога абітурыенты не першы год дэманструюць самыя нізкія вынікі. А якой думкі прытрымліваюцца на гэты конт самі арганізатары цэнтралізаванага тэсціравання?

— Тэст — не кантрольная работа ў школе, — дзеліцца сваім бачаннем сітуацыі Мікалай Фяськоў. — Час, неабходны для выканання асобных заданняў тэста і ўсяго тэста ў цэлым вызначаецца па выніках апрабацыі тэставага матэрыялу. Кантынгент удзельнікаў пры гэтым фарміруецца ў асноўным з навучэнцаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі розных тыпаў — ад звычайных гарадскіх і сельскіх агульнаадукацыйных школ да гімназій і ліцэяў.

Акрамя гэтага, апрабацыя тэставага матэрыялу праводзіцца ў ВНУ сярод студэнтаў першага года навучання, якія складаюць невялікую частку ад агульнай колькасці ўдзельнікаў ЦТ.

Упэўнены, што празмерна доўгі час на выкананне тэста можа прывесці да з'яўлення вялікай колькасці абітурыентаў з аднолькава высокімі баламі ці да стамлення абітурыентаў, а зусім кароткі час — правакаваць на ўгадванне правільных адказаў. Асаблівасць тэсціравання ў тым, каб выбраць рацыянальны шлях рашэння, таму калі хтосьці сцвярджае, што рашэнне заняло ў яго некалькі старонак, гэта значыць, што абітурыент выбраў не самы кароткі шлях. Да таго ж на тэсціраванні па фізіцы ў нас няма заданняў, дзе была б складаная матэматыка, якая аднімала шмат часу. Уявіце сабе: на выкананне 30 заданняў па фізіцы даецца 180 хвілін! Тры гадзіны напружанай работы і канцэнтрацыі ўвагі! Да канца тэсціравання ў аўдыторыі застаецца ўсяго 10-15 працэнтаў абітурыентаў, а прыкладна трэцяя частка абітурыентаў здае работы ўжо праз паўгадзіны пасля пачатку тэсціравання. Дык для каго павялічваць час правядзення тэсціравання?

Магчыма, камусьці будзе цікава даведацца, што ў Азербайджане, Казахстане і Турцыі асаблівасцю правядзення адбору прэтэндэнтаў на студэнцкі білет з'яўляецца здача інтэграванага тэста адразу па чатырох-пяці дысцыплінах, у тым ліку па матэматыцы, незалежна ад таго, кім яны хочуць быць («фізікамі» ці «лірыкамі»). Мне здаецца, што за тры—чатыры гадзіны нельга праверыць веды абітурыента па чатырохпяці дысцыплінах адначасова. Між іншым, абітурыенты за гэты час павінны даць адказы на 125 заданняў, а ў нас колькасць заданняў на ЦТ вар'іруецца ад 30 у тэстах па фізіцы і матэматыцы да 60 — па гуманітарных прадметах, а працягласць іспытаў — ад 90 да 180 хвілін.

Мікалай Фяськоў таксама дадаў, што **сёлета кошт удзелу ў рэпетыцыйным тэсціраванні павялічыўся да 30 тысяч рублёў за адзін прадмет**. Новы кошт вызначаўся з улікам росту выдаткаў на яго правядзенне: цэны на паперу, паліва за апошнія месяцы істотна выраслі... Дзеля справядлівасці трэба заўважыць, што рэпетыцыйнае тэсціраванне не даражэла да гэтага чатыры гады.

Для павышэння эфектыўнасці ад удзелу ў рэпетыцыі ЦТ можна скарыстацца паслугамі рэгіянальнага цэнтра тэсціравання і прафесійнай арыентацыі моладзі пры Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я.Купалы, які ўжо не першы год арганізуе пры падтрымцы Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў індывідуальныя кансультацыі для ўдзельнікаў рэпетыцыйнага тэсціравання. Там могуць пракансультаваць любога абітурыента, незалежна ад пункта праходжання тэсціравання і месца яго жыхарства. Мэта такой кансультацыі — ліквідацыя прабелаў у ведах і далейшая падрыхтоўка па тэматыцы тэставых заданняў, з якімі абітурыенты не справіліся на «рэпетыцыі» экзамену. Індывідуальная кансультацыя ўяўляе сабой рассылку вучэбна-метадычнага пакета, які змяшчае тэматыку раздзелаў школьнай праграмы па кожным няправільна выкананым заданні з указаннем года ці класа вывучэння адпаведнага раздзела, з рэкамендаваным спісам вучэбнай і метадычнай літаратуры, са зместам няправільна выкананых заданняў, правільнымі адказамі і ўказаннем да правільнага рашэння. Дарэчы, паказчык паспяховасці абітурыентаў, якія скарысталіся індывідуальнай кансультацыяй па выніках усіх трох этапаў рэпетыцыйнага тэсціравання, намнога вышэйшы на цэнтралізаваным тэсціраванні, чым сярэдні па вобласці.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Пункты рэгістрацыі для праходжання I этапа тэсціравання па жаданні (без выдачы сертыфікату)

г. Мінск

Установа адукацыі	Месца размяшчэння пункта рэгістрацыі, тэлефон
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт	г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 4, к.116, тэл.: 209-54-06
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі (Анлайн-рэгістрацыя)	г. Мінск, вул. П. Броўкі, 6, тэл.: 293-80-40
Міжнародны дзяржаўны экалагічны ўніверсітэт імя А.Д. Сахарава	г. Мінск, вул. Даўгабродская, 23, к. 107, тэл.: 230-73-72
Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт	г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 99, тэл.: 267-05-92, 267-72-68
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт	г. Мінск, пр. Незалежнасці, 65, тэл.: 237-39-25,
Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт (Анлайн-рэгістрацыя)	г. Мінск, вул. Захарава, 21, к. А, аўд. 214, тел.: 284-81-43
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт	г. Мінск, пр-т Партызанскі, 26, к. 3, аўд. 129, тел.: 209-78-15
Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка	г. Мінск, вул. Савецкая, 18, тел.: 200-94-17, 200- 92- 04
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт	г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, тэл.: 227-73-89, 227-07-78
Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь	г. Мінск, вул. Маскоўская, 17, тел.: 228-16-18
Ліцэй БДУ (Анлайн-рэгістрацыя)	г. Мінск, вул. Ульянаўская, 8, к.100, тэл.: 226-00-62

Брэсцкая вобласць

Установа адукацыі	Месца размяшчэння пункта рэгістрацыі, тэлефон
Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт	г. Брэст, вул. Маскоўская, 267, тэл.: 8 (0162) 42-70-11

Віцебская вобласць

Установа адукацыі	Месца размяшчэння пункта рэгістрацыі, тэлефон
Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт	г. Віцебск, пр-т Маскоўскі, 72, тэл.: 8 (0212) 47-72-34
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт	г. Наваполацк, вул. Блахіна, д. 29б, тэл.: 8 (0214) 53-05-35
Аддзел адукацыі Аршанскага гарадскога выканаўчага камітэта	г. Орша, вул. Замкавая, д.11, тэл.: 8 (0216)-21-33-04

Гродзенская вобласць

Установа адукацыі	Месца размяшчэння пункта рэгістрацыі, тэлефон
Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы	г. Гродна, вул. Ажэшкі, 22, тэл.: 8 (0152) 73-03-14 , 77-08-01.

Гомельская вобласць

Установа адукацыі	Месца размяшчэння пункта рэгістрацыі, тэлефон
Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П. Сухога (Анлайн-рэгістрацыя)	г. Гомель, пр-т Кастрычніка, 48, тэл.: 8 (0232) 47-52-74

Магілёўская вобласць

Установа адукацыі	Месца размяшчэння пункта рэгістрацыі, тэлефон
Беларуска-Расійскі ўніверсітэт	г. Магілёў, пр-т Міра, 43, аўд. 221, тэл.: 8 (0222) 25-36-03

У Мінскай вобласці рэпетыцыйнае тэсціраванне будзе праводзіцца ва ўсіх аддзелах адукацыі рай- і гарвыканкамаў.

Абзац

◢ Восьмая духоўна-асветная выстаўка «Пакроўскі кірмаш», якая пройдзе ў Мінску з 8 па 16 кастрычніка, прысвечана Дню маці. Выстаўка «Пакроўскі кірмаш» будзе працаваць з 10.00 да 19.00 у Палацы мастацтва ў Мінску.

◢ Паўсотні пешаходаў загінулі ў верасні на дарогах Беларусі па ўласнай віне, яшчэ 65 атрымалі цялесныя пашкоджанні.

◢ У Мінску пачаў працаваць сезонны каток на праспекце Пераможцаў. Першыя наведнікі ўжо апрабавалі новае пакрыццё пляцоўкі. Каток працуе з 10 гадзін раніцы да 23 вечара.

◢ Знакаміты амерыканскі тэлевядучы Лары Кінг хоча наведаць Беларусь. Аб гэтым ён заявіў учора ў інтэрв'ю расійскай радыёстанцыі «Рэха Масквы». Кінг выказаў жаданне ўзяць інтэрв'ю ў шэрагу беларускіх грамадскіх дзеячаў. «Мне гэта цікава, таму што мая маці нарадзілася ў Мінску», — сказаў ён.

Поўны абзац

◢ 100-гадовая бабуля замовіла на свой дзень народзінаў стрыптызёра. Гэтую ідэю Клэр Ормістан выказала яшчэ ў чэрвені, калі абгаворвалася святкаванне яе дня народзінаў у доме для састарэлых. Дачка прапанавала спячы вялікі торт і запрасіць кватэт, які грае класічную музыку. На што бабуля адказала: «А як наконт стрыптызу?» Дачка Маргарыта ледзь не звалілася з койкі. У рэшце рэшт на свята запрасілі стрыптызёра Джона Грына, сцэнічнае імя якога — Скарпіён. «Упершыню я выконваў стрыптыз на 100-м дні народзінаў, але, думаю, імянінніцы спадабалася», — падзяліўся ўражаннямі Джон. А дачка дадала: «Мяркую, што пачуццё гумару дапамагае ёй трымацца так доўга».

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

А ўся справа — набраць самому нумар тэлефона...

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

З Пастаўскага раёна патэлефанаваў мужчына, прасіў дапамагчы сваёй пажылой сястры, ужо шмат гадоў як пенсіянеркі, якая пражывае ў Дзісне Міёрскага раёна. У чым была сутнасць праблемы?

Жанчына павінна была атрымаць 500 тысяч рублёў сацыяльнай дапамогі — на «бульбу». Грошай ёй не далі, бо высветлілася, што па дакументах яна праходзіць як працуючы чалавек. Патэлефанавалі ў райсабес, там адказалі: маўляў, няма праблем, падыходзьце з пашпартам і працоўнай кніжкай, выправім недарэчнасць і грошы вы атрымаеце. З якой нагоды тады на «гарачую лінію» газеты патэлефанаваў брат жанчыны? Заяўнік даводзіў нам, што сястра — не толькі пажылая, але і хварэе, з дому практычна не выходзіць. Нават купіць прадукты, штосьці з патрэбнага, вымушана недзе раз на тыдзень прасіць суседзяў...

З яго слоў вынікала, што з рэдакцыі павінны былі патэлефанаваць у райсабес і вырашыць праблему, што ўзнікла. Мужчына нам нават нумар патрэбнага тэлефона прадыктаваў. А ці звяртаўся па гэтым нумары ён сам, ці спрабаваў нешта высветліць, патлумачыць сітуацыю? Высветлілася, што не... Пад'ехаць да сястры ён таксама не мог: паліва дорага каштуе. Хіба сястра адзінокая? Ды не, у тым жа населеным пункце пражывае дачка з мужам і дзецьмі. Аднак зяць зараз за мяжой, дзеці ходзяць у школу, ды і ўвогуле — жывуць яны на іншым краі Дзісны. Але ж можна было некаму з родных знайсці час, няхай і не адразу, каб дапамагчы пажылому чалавеку? А чаму ў райсабесе не ідуць насустрач простым людзям, прагучала ў слухаўцы замест адказу па сутнасці... А суседзі? Няёмка турбаваць чужых людзей, зноў быў кароткі водгук...

Ні ў якім разе не імкнучыся пакрыўдзіць заяўніка, тым не менш, можна смела сказаць: такі падыход да справы — выключна спажывецкі. На жаль, не адзінкавы ў нашай практыцы. Пра што мы і сказалі заяўніку, прапанаваўшы самому напачатку патэлефанаваць у райсабес. Няўжо там такія бессардэчныя людзі, што не здолеюць дапамагчы?!.

...Наступным днём мы ўсё ж звязаліся з **намеснікам начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Міёрскага райвыканкама Ірынай ІВАНОВАЙ**. Суразмоўца паведаміла, што, на жаль, такая сітуацыі, у якую патрапіла жыхарка Дзісны, не адзінкавая. «Іх шмат, і гэта недапрацоўка наймальнікаў», — зазначыла Ірына Баляславаўна. Аднак сітуацыя вырашаецца дастаткова проста, што і было зроблена ў дачыненні да пажылой жанчыны. У прыватнасці, сама намеснік начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне райвыканкама двойчы размаўляла з жанчынай. Усё было ўладжана, і апошняя праз пошту павінна была атрымаць належныя ёй грошы літаральна наступным днём пасля нашай размовы з Ірынай Баляславаўнай. А ці тэлефанаваў брат? Бо, нягледзячы на дамоўленасць, у рэдакцыю ён так больш і не звярнуўся, каб расказаць, чым скончылася гісторыя. Так, званіў. І яму патлумачылі, што існуе мноства варыянтаў, як можна было перадаць патрэбныя звесткі пра тое, што яго сястра ўжо даўно знаходзіцца на пенсіі...

Сяргей РАСОЛЬКА.

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ ОБ ОТКАЗЕ ОТ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОНОВ И КОНКУРСОВ

ГОСУДАРСТВЕННЫЙ КОМИТЕТ ПО ИМУЩЕСТВУ СООБЩАЕТ ОБ ОТКАЗЕ ОТ ПРОВЕДЕНИЯ

• объявленного на 13 октября 2011 г. аукциона по продаже принадлежащих Республике Беларусь 12716 акций (85,1 % уставного фонда) открытого акционерного общества «Комбинат общественного питания и торговли «Борисовлес». Извещение о проведении указанного аукциона было опубликовано в газете «Звязда» от 10 сентября 2011 г.

• объявленных на 31 октября 2011 г. аукционов по продаже принадлежащих Республике Беларусь

48 487 акций (24,0 % уставного фонда) открытого акционерного общества «Пинский опытно-механический завод»;

461 701 акций (91,2 % уставного фонда) открытого акционерного общества «Пуховичский опытно-экспериментальный завод»;

835 373 акций (97,8 % уставного фонда) открытого акционерного общества «Бобруйсксельмаш»;

1 362 988 акций (99,6 % уставного фонда) открытого акционерного общества «Слуцкий завод «Эмальпосуда»;

1 179 075 акций (93,7 % уставного фонда) открытого акционерного общества «Технолит Полоцк»;

55 566 акций (37,3 % уставного фонда) открытого акционерного общества «Кричевгрузавто»;

199 618 акций (94,4 % уставного фонда) открытого акционерного общества «Слонимский авторемонтный завод»;

107 949 акций (43,8 % уставного фонда) открытого акционерного общества «Спецавтотехника»;

1 696 810 акций (99,99 % уставного фонда) открытого акционерного общества «ТрансМозырь»;

53 268 акций (91,7 % уставного фонда) открытого акционерного общества «Новогрудское строительно-монтажное управление»;

3 714 652 акций (94,6 % уставного фонда) открытого акционерного общества «Скидельский Сахарторг»;

54 865 акций (24,9 % уставного фонда) открытого акционерного общества «Бобруйская обувная фабрика»;

120 893 акций (76,8 % уставного фонда) открытого акционерного общества «Картонная фабрика «Ольховка»;

31 488 акций (48,7 % уставного фонда) открытого акционерного общества «Барановичидрев»;

14 302 акций (10,0 % уставного фонда) открытого акционерного общества «Минсктелекомстрой»;

31 211 акций (26,6 % уставного фонда) открытого акционерного общества «ГродноАТЭП». Извещение о проведении указанных аукционов было опубликовано в газете «Звязда» от 20 сентября 2011 г.

• объявленных на 4 ноября 2011 г. аукционов по продаже принадлежащих Республике Беларусь 56496 акций (32,6 % уставного фонда) открытого акционерного общества «Белкофе» и 3106591 акций (89,8 % уставного фонда) открытого акционерного общества «Бобруйскэнергомонтаж». Извещение о проведении указанных аукционов было опубликовано в газете «Звязда» от 27 сентября 2011 г.

• объявленных на 2 ноября 2011 г. конкурсов по продаже принадлежащих Республике Беларусь

847 991 акций (100 % уставного фонда) открытого акционерного общества «Слуцкий завод подъемно-транспортного оборудования»;

80 303 акций (38,3 % уставного фонда) открытого акционерного общества «БобруйскАТЭП»;

243 028 акций (47,3 % уставного фонда) открытого акционерного общества «Бобруйский грузовой автомобильный парк №1»;

231 740 акций (48,4 % уставного фонда) открытого акционерного общества «Бобруйсктранс»;

110 610 акций (42,2 % уставного фонда) открытого акционерного общества «Борисовгрузавтотранс»;

330 144 акций (46,6 % уставного фонда) открытого акционерного общества «Красносельск-автотранс»;

2 264 843 акций (100 % уставного фонда) открытого акционерного общества «Агропромстроймаш», г. Барановичи;

103 367 акций (76,6 % уставного фонда) открытого акционерного общества «Барановичский завод станкопринадлежностей»;

862 642 акций (96,9 % уставного фонда) открытого акционерного общества «Гидросельмаш», г. Пинск;

81 866 акций (46,5 % уставного фонда) открытого акционерного общества «Новогрудский грузовой автомобильный парк»;

1 186 218 акций (23,7 % уставного фонда) открытого акционерного общества «Белоозерский энергомеханический завод»;

267 765 акций (92,9 % уставного фонда) открытого акционерного общества «Бумажная фабрика «Красная Звезда», г. Чашники. Извещение о проведении указанных конкурсов было опубликовано в газете «Звязда» от 20 сентября 2011 г.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

Государственное производственное объединение «МИНСКСТРОЙ»

220050, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А
режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв 13.00–14.00,
тел.: 227 52 36, 226 03 01

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Выполняя функции заказчика, объединением с 2005 по 2010 год построены и введены в эксплуатацию жилые дома:

- ул. Захарова, д. 67, корп. 1, ул. Великоморская, д. 10, ул. Великоморская, д. 12, ул. Роменская, д. 5, ул. Матусевича, д. 90, пр-т Рокоссовского, д. 76, д. 78, пр. Рокоссовского, 80, пр-т Независимости, д. 168, корп. 1, пр-т Независимости, д. 168, корп. 2, пр-т Независимости, д. 168, корп. 3, ул. Есенина, д. 30, ул. Есенина, д. 34, ул. Есенина, д. 36, д. 38, ул. Матусевича д. 52 и др.

Лицензия № 02250/0264117 выдана Министерством архитектуры и строительства РБ 09.04.2007 года сроком на пять лет.

18.30 «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
19.00 «Сёння. Падагульняючая праграма».
20.00 «Чыстасардэчнае прызнанне».
20.45 «Цэнтральнае тэлебачанне».
21.55 «Тайны шоу-бізнэс: «Ласкавы май». Загадка знікнення мільярда».
22.55 «НТБшнікі».
0.00 Маст. фільм «Страшныя лейтэнанты».

ТНТ

5.00 М/с «Гэй, Арнольд!».
6.00 М/с «Як кажа Джынджэр».
7.25, 8.00 «Жаночая ліга».
7.55 «Лато Спорт Супер».
8.50 «Латарэі: «Першая Нацыянальная» і «Фабрыка ўдачы».
9.00, 2.50 «Школа рамонту».
10.00 «Суперінтуіцыя».
11.00 «Спакусы». Дак. фільм.
12.00 «Папялушка. Перазагрузка».
12.30 «Шчаслівыя разам».
14.00 «Інтэрны».
16.05 «Прытулак зла-3». Баявік.
18.00, 21.00 «Камедзі Клаб».
19.00 «Шлях воіна». Баявік.
22.00, 23.00, 1.50 «Дом-2».
23.30 «Хаціко: самы верны сябар». Драма.
1.20 «Сэкс» з Анфісай Чэхавай.
3.50 «Cosmopolitan». Відэаверсія».
4.50 «Саша + Маша».

ІНТЭР+

7.40 Самы разумны.
9.05, 12.55 Ілюзіі сучаснасці.
9.30 Школа доктара Камароўскага.
10.00 Ранішняя пошта.
10.30 Смачная ліга.
11.15 Арол і рэшка.
12.00 Разбор палётаў.
13.25 Пазавочы. Алеся Жалязняк.
14.05 Серыял «Юрыкі».
14.30, 23.20 Маст. фільм «Шах каралеве брыльянтаў».
16.00, 1.15 Футбол. Чэмпіянат Украіны. «Карпаты» — «Арсенал».
18.00, 0.45 Легенды крымінальнага вышуку.
18.30 Маст. фільм «Следствам устаноўлена».
20.00, 3.00 Падрабязнасці тыдня.
20.45, 3.45 Маст. фільм «Падарожжа будзе прыемным».
22.00, 5.45 Канцэрт хору Турэцкага «Шоу пачынаецца».
5.00 Формула кахання. Зорныя маці-адзіночкі.

КУЛЬТУРА

5.30 «Ёўраньюс».
9.00 «Звычайны канцэрт».
9.35 «У адзін цудоўны дзень». Маст. фільм.
11.05 Да 90-годдзя з дня нараджэння Іва Мантана. «Легенды сусветнага кіно».
11.35 «Васіліса Мікулішна». «Храбрае аленяня». «Шэрая шыйка». «Сцёпа-марак». М/ф.
13.00 «Крылы прыроды». Дак. серыял. 1-я серыя.
13.50 «Што рабіць?».
14.40 Балет «Шчаўкунчык».
16.35 «Шукальнікі».
17.20 «Ноч у музеі».
18.05 Вялікая опера. Конкурс маладых выканаўцаў.
19.40 «Уладзімір Васільеў. Я працягваю жыцця бег...» Творчы вечар.
21.00 «Кантэкст».
21.40 «Гоя, або Цяжкі шлях пазнання». Маст. фільм.
23.55 «Найвялікшае шоу на Зямлі. Бетховен».
0.40 «Гісторыя аднаго горада». М/ф для дарослых.

НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «Адна гадзіна з Рыгорам Козінцавым». Дак. фільм.
6.00 «Ранішняя пошта». 1988 год.
6.30 «Алё, Варшава!». Маст. фільм.
8.00, 14.00, 2.00 «Мінулы час».
9.00 «Колба часу».
10.00 Праграма «Погляд». 1988 год.
11.00 «Да і пасля...». Год 1970.
12.30 «Шынок 13 крэслаў». 1968 год.
13.40 «Маленькі канцэрт».
15.00 «Мужчыны і ўсе астатнія». Маст. фільм.
16.25 «Рына Зялёная». 1969 год.
17.00 «Жорсткае, жорсткае Каханне». Дак. фільм.
18.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР».
19.15 «КВЗ-89».
20.00 «Быў час».
21.00 «Бушуе «Маргарыта». Фільм-рэвю. 1970 год.
22.10 «Заваёўнікі гор». Маст. фільм.
22.30 «Спявае Дзін Рыд». 1980 год.
23.00 «Аншлаг? Аншлаг!». 1988 год.
0.10 «Наш адпачынак». Дак. фільм.
0.40 «Джамайка». Маст. фільм.
4.00 «Спявае Адрыяна Чэлентана». 1987 год.

MTV

5.00, 1.00 Music.
6.00 Стэрэа_раніца.
8.30 «Губка Боб». М/ф.
10.00 News блок Weekly.
10.30 Ікона відэагульняў.
11.00 «13 кіналаж».
11.30, 21.30 Трэндзі.
12.00 Тайн.net.
13.00, 18.00 Шопаголікі.
14.00 «Канікулы ў Мексіцы».
17.00 Праверка чутак.
17.30, 21.00 Зоркі на далоні.
19.00 «Сябры». Серыял.
20.10 «Два з паловай чалавекі». Серыял.
22.00 Ноч на віле.
23.10 Пляж.
0.00 Буду нараджаць.

НАША КІНО

6.30, 12.30 Трагікамедыя «Шапка».
8.30, 14.30 Меладрама «Калі дрэвы былі вялікімі».
10.30, 16.30 Драма «Загад: агонь не адкрываць».
18.30, 0.30 Меладрама «Ганна на шыі».
20.30, 2.30 Драма «Транзіт».
22.40, 4.40 Драма «Загад: перайсці мяжу».

ДОМ КІНО

3.00, 12.00, 19.10 Серыял «Таццянін дзень».
3.45 Сусветнае «Вяселле па абмене».
5.20 Трагікамедыя. «Бумбараш».
7.30 Меладрама «Раман «alla Russa».
8.55 Мюзікл па-руску. «Сватаўство гусара».
10.05 Экранізацыя школьнай праграмы. «Таня».
12.45 Фантастыка. «Маўчанне доктара Івенса».
14.05 Іранічны дэтэктыў. «Мой асабісты вораг». 1-я серыя.
17.35 Новы хіт. Меладрама «Узгоркі і раўніны».
20.00 Золата «Масфільма». «Вакзал для дваіх».
22.15 Новы хіт. Меладрама «Шэпт аранжавых аблокаў».
0.00 Дэтэктыў «Мой пяшчотна любімы дэтэктыў».
1.20 Меладрама «Нюрчына жыццё».

ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

5.00, 9.00, 13.00, 15.00 Серыял «Госця з будучыні».
6.05, 10.05, 14.05 М/с «Шапакляк». Зборнік м/ф: «Умка», «Умка шукае сябра», «Чые ў лесе шышкі?».
7.00, 11.00 Маст. фільм «Тайна горнага падзямелля».
8.15, 12.15 Казкі народаў свету. «Залатое пёрка». Зборнік м/ф: «Воўк і сямёра казлянят», «Прыязджайце ў госці».
16.05 М/ф «Чабурашка ідзе ў школу». Зборнік м/ф: «Цудны сярод белага дня», «Дзіцячы альбом».
17.00 Казкі замежных пісьменнікаў. «Котка, якая гуляла сама па сабе».
18.10 Казкі народаў свету. «Сын каменя», «Сын каменя і велікан».

ТЭЛЕКЛУБ

19.00, 1.00 Серыял «Агенцтва «Залатая куля».
20.00, 2.00 Серыял «Дарагі мой чалавек».
21.00, 3.00 Серыял «Сышчыкі-4».
22.00 Серыял «Група рызыкі».
23.30 Серыял «Памылка рэзідэнта». 1-я серыя.

ТБ3

5.00, 9.00, 4.00 М/ф.
5.45 Серыял «Зена — каралева воінаў».
6.45 М/ф «Паляўнічыя на прывідаў».
7.15 М/ф «Сябры анёлаў».
7.30 М/с «Братц».
8.00 М/ф «Бакуган».
8.30 М/ф «Фостэр: дом для сяброў са свету фантазій».
9.15 Маст. фільм «Коткі супраць сабак».
11.00 Здзіві мяне.
12.00 «Разбуральнікі міфаў».
13.00 Маст. фільм «Эвалюцыя».
15.00 Маст. фільм «Выбух з мінулага».
17.00 Дак. фільм «Законы бяссмерця».
18.00 Маст. фільм «Малы».
20.00 Маст. фільм «Іствікскія ведзьмы».
22.15 Серыял «Прыцяжэнню насуперак».
23.15 Маст. фільм «Апраўданая жорсткасць».
1.15 Маст. фільм «Байцоўскі клуб».

ТБ-21

9.00, 17.00, 1.00 Серыял «Забойства ў вышэйшым грамадстве».
10.40, 18.40, 2.40 Камедыя «Сустрэча з бацькам».
12.15, 20.15, 4.15 Драма «Матч поінт».
14.25, 22.25, 6.25 Камедыя «Хрусталёў, машыну!».

ТБ1000

3.00, 21.00 Камедыя «Самы лепшы тата».
4.50 Трылер «Трэніровачны дзень».
7.10 Баявік «Смяротная зброя 4».
9.30 Камедыя «Кожны Божы дзень».
11.20 Камедыя «Піўная ліга».
13.10 Прыгоды «Амазонкі і гладыятары».
15.00 Меладрама «Блакітная хваля».
17.00 Драма «Псіхааналітык».
19.00 Камедыя «Тэорыя хаосу».
22.50 Вестэрн «Недараваны».
1.10 Трылер «Эксперымент 2: Хваля».

DIVA UNIVERSAL

5.00 Дамы сям'і Гілмор.
9.10 Нявеста для мільянера.
10.50, 19.10 Копы-навабранцы.
11.40, 20.00 Бацькі.
13.20 Драма «Вырашальны рывок».
15.10 Драма «Балетныя туфлікі».
16.50 Камедыя «Місіс Вашынгтон едзе ў каледж Сміта».
18.20 Пляткарка.
20.45 Шпік.
22.20 Маст. фільм «100 праблем і дзяўчына».
23.55 Сапраўдныя хатнія гаспадыні Нью-Ёрка.
1.35 Джордан расследуе.
3.20 Дочкі Маклеода.

РАМАНТЫКА

7.00, 18.40, 21.30, 0.55 «Без вестак зніклая».
7.55 «Тайна Лауры».
9.45 «Кругасветнае падарожжа».
12.20, 17.50 «Смачнае захапленне».
13.20 «Доля-ліхадзейка».
19.35, 1.50 «Спакуснік».
22.25 «Восеньскі вальс».
0.00 «Неўтаймоўная Хільда».
2.40 «Паслухай, красуня».

AXN-SciFi

0.25, 5.00, 11.00, 22.55 Зорны шлях.
2.15 Стаўпы Зямлі.
3.00, 7.05, 16.50, 21.40 Фактар страху.
3.45, 4.35, 8.40, 13.15 Зорны дэсант.
4.10 Сшытак смерці.
7.55, 16.00 Псі фактар.
9.35, 14.25 Гарады падзямелля.
14.00, 22.25 Страшна цікава.
17.40 Чорная лагуна.
20.00 Стаўпы Зямлі.

21.00 ФІЛЬМ ДНЯ

«ВЯСНА, ЛЕТА, ВОСЕНЬ, ЗІМА... І ЗНОЎ ВЯСНА»

(ПАЎДНЁВАЯ КАРЭЯ—ГЕРМАНІЯ, 2003 г.)

У ціхамірным горным краі, дзе жыццё падпарадкоўваецца рытму прыроды, па чыстай азёрнай роўнядзі дрэйфуе пагада. Яе насельнікі — стары манах-лекар і яго юны выхаванец, і хоць ад Вышэйшай Ісціны старога аддзяляе толькі тленная абалонка, ён не ў сілах прадухіліць будучыні падзеі, як нікому не дадзена павярнуць назад змену часоў года.

Рэжысёр — Кім Кі Дук. **У ролях:** О Ёнсу, Кім Ёнмін, Кім Кі Дук, Со Джэгён.

У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена!

EUROSPORT

9.30 Фехтаванне. Чэмпіянат свету.
10.30 Марафон. Амстэрдам.
13.00 Тэніс. Турнір WTA. Чэмпіянат свету.
13.45, 17.00, 1.15 Супербайк. Чэмпіянат свету.
15.00 Суперспорт. Чэмпіянат свету.
18.30, 0.15 Тэніс. Турнір WTA. Фінал.
20.00 Артыстычны більярд. Чэмпіянат свету.
21.00 Артыстычны більярд. Чэмпіянат свету. Фінал.
22.00 Бокс. Bigger's Better.
0.00, 2.15 Мотаспорт. Мотаспартыўны часопіс.
2.30 — Тэхнічны перапынак.

NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00, 12.00, 18.00 Супераўтамабіль маркі «Бугаці».
6.00 Жыццё калібры.
7.00 Рыбы-пачвары.
8.00 У пошуках акул.
9.00 На кручку.
10.00 Дэтэктывы-дайверы.
11.00 Вядомы Сусвет.
13.00 Небяспечныя сустрэчы.
14.00 Следства па справах драпежнікаў.
15.00 Тайны старажытнасці.
19.00, 4.00 Цалкам сакрэтна.
20.00, 23.00, 2.00 Погляд знутры.
21.00, 0.00, 3.00 Забароны.
22.00, 1.00 З пункту гледжання навукі.

DISCOVERY

7.00 «Маланкавыя катастрофы».
7.55, 3.50 «Галаваломы».
8.50, 21.00, 2.55 Разбуральнікі легенд.
9.45, 4.45 Як гэта ўстроена?
10.10 Як гэта зроблена?
10.40 Выжыць любой цаной.
11.35 «Выжыць удваіх».
12.30 «Браты па багне».
13.25 Сусвет Стывена Хокінга.
15.15 Як уладкаваны Сусвет.
16.10 Мужчына, жанчына, прырода.
17.05 Каралі аўкцыёнаў.
18.00 Праект «Зямля».
22.00 Хлопцы з гарматамі.
23.00 Самыя цяжкія ваенныя прафесіі.
0.00 Баявыя машыны.
1.00 «Эра дыназаўраў».
2.00 Лабараторыя Спецэфектаў.
5.10 «Грандыёзныя пераезды».
6.05 Гіганцкія будоўлі.

ANIMAL PLANET

0.00 Падарожжа ў «Трабанце».
0.30 Серфары.
1.00 Мараплаўцы.
2.00, 10.00, 14.00, 17.00, 21.00 Сусветны падарожнік.
6.00 Бясстрашныя падарожнікі.
7.00 Круіз сёння.
7.30, 12.30 Смак.
8.00, 11.00 Планета ежы.
9.00 Сакрэты Бангкока.
12.00 Шэф-кухар за мяжой.
13.00, 20.00 Пра галоўнае...
15.00 Людзі мора.
16.00 Кароткая гісторыя турэмнай Аўстраліі.
18.00 Планета спорту.
19.00 Раскошныя падарожжы з Варунам Шармай.
22.00 Свет жанчыны.

TRAVEL

7.00 Маёнтак сурыкатаў.
7.25, 6.10 «Заатур Мікаэлы».
8.15 Усё пра сабак.
8.40 «Самае дзікае шоу».
9.10 Планета малых.
10.05 Прыроджаныя паляўнічыя.
10.30 Джэф Корвін на волі.
11.00 Паляўнічы на кракадзілаў.
11.55, 0.45, 5.20 Уводзіны ў сабаказнаўства.
12.50 «Хуткасць жыцця».
13.45, 20.10 Перакладчык з сабачай.
14.40 «Котак не любіць нельга».
15.35 Дрэнны сабака.
16.30 «Пякельная котка».
17.25 Жыццё ў зграі.
18.20 Паляўнічы на яд.
19.15 Якія ваююць са шкоднікамі.
21.05, 1.40 Зямля звяроў з Дэйвам Салмоні.
22.00, 2.35 У нетрах Афрыкі.
22.55, 3.30 Кітовыя войны.
23.50, 4.25 Дзікія і небяспечныя.

ЗДАРОЎЕ

5.00, 20.00 Гісторыя хвароб.
5.40, 20.40 Як не страціць здароўе.
6.10, 21.10 Энцыклапедыя памылак.
6.25, 18.45, 21.25 Азбука здароўя.
6.30, 21.30 Школа розуму.
7.10, 16.10 Генезіс здароўя.
8.00, 23.00 Практыка здароўя.
8.40, 23.40 Зялёная аптэка.
9.20, 0.20 Метэазалежнасць.
9.50, 18.20, 0.50 Шлях да здароўя.
10.30, 1.30 Жаночае здароўе.
11.00, 2.00 Вялікая прабежка.
11.40, 2.40 Элемент здароўя.
12.20, 3.20 Я расту.
12.50, 3.50 Пра дыеты і не толькі.
13.30, 4.30 Як Вы сябе адчуваеце?
14.00 Дыялогі пра харчаванне.
14.50 Цела чалавека.
15.30 Што мы носім?
17.00 Праўда пра пахудзенне.
17.40 Мужчынскія сакрэты.
18.50 Найноўшыя дасягненні.
19.30 Зона рызыкі.
21.10 Энцыклапедыя памылак.
22.10 Як дажыць да 101 года.

ТДК

6.00, 7.50, 13.00, 16.55, 17.50, 18.50 Парады ТДК.
6.25, 9.00, 14.30, 21.20 Усё лепшае для вас.
7.25, 12.00, 18.00, 21.00, 5.00 Ваш доктар.
8.00 Добрай раніцы, каханая!
10.00, 17.00, 23.45 Красуня.
11.00, 16.00, 20.00 Ваш асабісты псіхолаг.
13.30, 2.00 Нашы дзеці.
15.30 Латарэя «Бінга».
19.00, 22.50, 4.00 Люстэрка жыцця.
22.00, 0.05 Сэксуальная рэвалюцыя.
1.00 Твой дом.
3.00 Маст. фільм.

Организация купит рапс в неограниченном количестве.
Цена договорная.
Тел. (8 029) 676 45 97, (8 029) 623 14 80
УНП 391000431

Падпіска-2011

НОВЫЯ ПРЫЗЫ — СТАЛЫМ ПАДПІСЧЫКАМ

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Паважаныя падпісчыкі! У папярэднім выпуску газеты быў надрукаваны анонс аб праведзеным розыгрышы прызоў сярод тых прыхільнікаў старэйшага беларускамоўнага выдання, якія аформілі падпіску на 4-ы квартал ці другое паўгоддзе 2011 года.

ХОЧАЦЦА выказаць словы падзякі людзям, якія, нягледзячы на розныя эканамічныя цяжкасці і рост цэн, знайшлі магчымасць сабрацца з думкамі пра лепшае і стаць паўнапраўнымі ўдзельнікамі рэкламнай гульні.

Як і раней, мы пастараліся выставіць на кон каштоўныя прызы, якія могуць прыдацца ў гаспадарцы кожнаму руплівому гаспадару. Упэўнены, што абсалютная большасць нашых чытачоў такімі і з'яўляюцца.

Спадзяёмся, што з наступленнем халадоў і заканчэннем сельскагаспадарчых работ, у тым ліку і на дачах, у нашых падпісчыкаў з'явіцца больш вольнага часу для таго, каб праявіць актыўнасць у розыгрышы прызоў на 1-ы квартал і першае паўгоддзе 2012 года. Яшчэ раз прасілі б, паважаныя звяздоўцы, дасылаць купоны ў рэдакцыю ў тым выглядзе, як яны друкуюцца ў газеце, і не падклейваць на цвёрдую паперу ці кардон.

Выбачайце, калі ў сённяшнія надрукаваныя спісы ўкралася недакладнасць, таму што не ўсе квіткі запоўнены разборліва. Таму вельмі хацелася, каб у наступны раз у вашых беларускамоўных лістах мы бачылі толькі зразумелы почырк.

Свае прызы можна атрымаць у рэдакцыі, пачынаючы з 7 верасня. Пры іх атрыманні варта мець падпісную квітанцыю і пашпарт. Па ўжо заведзенай традыцыі найбольш каштоўныя экзэмпляры — мікрахвалевую печ і параваркі журналісты «Звязды» даставяць новым уладальнікам па месцы іх пражывання і ўручаць ва ўрачыстай абстаноўцы ў прысутнасці адказных работнікаў пошты і мясцовай «вертыкалі». У выпадку неабходнасці астатнія прызы мы таксама пастараемся даставіць адрасатам у час правядзення наступнай падпісной кампаніі. А гэты ўжо здарыцца вельмі хутка.

Зычым злавіць птушку ўдачы тым падпісчыкам, каму яшчэ фартуна не ўсміхнулася. Заставайцеся з намі, гуляйце і выйгравайце.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

5 кастрычніка 2011 года адбыўся розыгрыш прызавога фонду рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду», арганізатарам якой з'яўляецца ўстанова «Рэдакцыя газеты «Звязда» (УНП 100155376), размешчаная па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Рэкламная гульня «Падпішыся на «Звязду» зарэгістравана Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь 18 жніўня 2011 года (пасведчанне № 1915) і праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 30 жніўня па 31 снежня 2011 года ўключна сярод падпісчыкаў газеты «Звязда» чацвёртага квартала або другога паўгоддзя 2011 года.

Удзел у гульні прыняло 438 падпісчыкаў газеты «Звязда». Прызавы фонд гульні разыграны цалкам.

Прызы сярод удзельнікаў гульні размеркаваліся наступным чынам:

электрапрасы «Віцязь-604», г. Віцебск, выйгралі:

БУРА Лідзія Кірылаўна, в. Ліпава Кобрынскага раёна;

КАСАБУЦКІ Анатоль Сцяпанавіч, г. Сянно Віцебскай вобласці;

СВІРЫДЗЕНКА Павел Аляксандравіч, г. Гомель;

ЖЫДЗЕЛЬ Іван Станіслававіч, г. Іўе Гродзенскай вобласці;

САМЕЦ Зоя Іванаўна, г. Клічаў;

ПРОТАС Лаўр Канстанцінавіч, в. Лотва Мядзельскага раёна;

РАМАНЧУК Аляксей Тарасавіч, г. Мінск;

электрачайнікі «Атлант-01», г. Мінск, выйгралі:

ЛЯШКЕВІЧ Барыс Міхайлавіч, в. Альшаны Столінскага раёна;

РАБІЗО Лія Пятроўна, Вялікае Сяло Шаркаўшчынскага раёна;

АСТАПАВА Арына Пятроўна, г. Гомель;

ТАБАЛА Вера Сцяпанаўна, в. Дубна Мастоўскага раёна;

КОРЖЫЧ Любоў Аляксандраўна, г.п. Хоцімск;

МАТУШЭЎСКАЯ Ніна Міхайлаўна, в. Папоўцы Слуцкага раёна;

ЖЭБРАК Вера Кузьмінічна, г. Мінск;

электрапараваркі ЭПВ М-120, 75801, РБ, выйгралі:

ПЯТРОВІЧ Лідзія Андрэеўна, г. Брэст;

ЛОГІНАВА Валянціна Паўлаўна, в. Арэшанкі Віцебскага раёна;

ПЯШЭВІЧ Васіль Мікітавіч, в. Юркевічы Жыткавіцкага раёна;

СІДЛЯРЭВІЧ Марыя Сямёнаўна, г.п. Воранава Гродзенскай вобласці;

МАЛАШКОЎ Леанід Ерафеевіч, в. Чырвоны Асавец Быхаўскага раёна;

САМОЙЛЕНКА Аляксандра Канстанцінаўна, в. Пацейкі Капыльскага раёна;

ПАДЛІПСКАЯ Марыя Мікалаеўна, г. Мінск;

печ ЗВЧ «Віцязь» 1479-МП 20-800-5, г. Віцебск, выйграў:

РЭУЦКІ Віктар Рыгоравіч, в. Стара-Барысаў Барысаўскага раёна.

ТЭЛЕФОН ДЛЯ ДАВЕДАК ПА ПЫТАННЯХ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ: (017) 287 19 68.

РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 09 ноября 2011 г. ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО РУП «БЕЛПОЧТА»

№ лота	Наименование, местоположение и краткая характеристика имущества	Начальная цена продажи, руб.	Сумма задатка, руб.	Общая площадь	Коэф. от 0,5 до 3,0	Цель использования
ЛОТ № 1	«Отделение почтовой связи», Брестская обл., г. Пинск, ул. Центральная, 13, часть помещения на 2-м этаже (инв. № 130/С-35420)	485 625	48 563	55,50	3,00	Для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, производства (кроме вредных производств)

Предмет аукциона	Право заключения договора аренды
Наименование арендодателя	РУП «Белпочта»
Срок договора аренды	5 лет
Условия	1. С победителем аукционных торгов в течение 5 рабочих дней будут заключены договора аренды нежилых помещений. 2. Стоимость права заключения договора аренды должна быть выплачена продавцу в течение 3-х раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона за вычетом задатка. 3. Возместить Организатору аукционных торгов расходы по их проведению в течение 3-х раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 3012000511012 руб. РБ в ЗАО «Цептер Банк» ЦБУ 5 г. Минск, ул. Платонова, 1 б, код 153001820, УНП 102353509

Аукцион состоится 09 ноября 2011 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Для участия в аукционе необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с Филиалом «Центр «Белтехинвентаризация».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;
представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
5. Индивидуальным предпринимателям - копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.
Последний день приема заявлений – 08 ноября 2011 г. до 17.00.
Контактные тел.: 8 (0162) 23 92 59, 21 88 81.

САПРАЎДНАЕ АБРАБАВАННЕ

На здымках камеры відэаназірання ў горацкай «Пельменнай» — сапраўднае крымінальнае кіно. Мужчына, узброены пісталетам, патрабуе грошай. «Гэта абрабаванне!» На жаль, не кіношнае, а зусім рэальнае.

Познім вечарам у кавярні ў горадзе Горкі мужчына выпіў піва. Наведвальнік пацікавіўся ў бармена, калі зачыняецца ўстанова, і паабяцаў яшчэ вярнуцца. Абяцанне спраўдзіў, толькі вось пасля апоўначы выцягнуў пісталет (потым высветліцца, што не баявы) і запатрабаваў аддаць выручку. Бармен, 44-гадовая жанчына, грошы аддала, але паспела націснуць на трывожную кнопку аховы. Аднак злодзей паспеў уцячы і забраў каля 1,5 мільёна рублёў. Над высвятленнем яго асобы працавала міліцыя: аказалася, што разбой у Горках учыніў

Здароўе нацыі

БАЙКІ ПРА АЛКАГАЛІЗМ,

АБО ПАКІНЬЦЕ Ў СПАКОІ МАРАЛЬНЫЯ ЯКАСЦІ ЗАЛЕЖНЫХ

Фота Анатоля КЛЕПЧУКА

ВОСЬ ужо гадоў як дзвесце алкагалізм і наркаманія адносяцца да захворванняў псіхікі, аднак і сёння яшчэ застаюцца тыя, хто думае, што размова ідзе пра падзенне маралі асобна ўзятага індывідыума. Адсюль і паходзяць абсурдныя парады хворым кшталту «ўзяўся б ты за розум», «збяры волю ў кулак» і г.д. Такая недасведчанасць патурае росквіту міфаў аб людзях, якія, здаецца, «проста распусціліся». Так замацоўваецца скажонае ўяўленне аб тых, хто сутыкнуўся з цяжкай медыка-сацыяльнай праблемай. Насамрэч паняцці маралі, сілы волі не маюць прыпісанага ім значэння. Дастаткова сказаць, што «чалавечы і маральны выгляд» залежны страчвае паступова, па меры таго, як хвароба разбурае яго здароўе, у тым ліку псіхічнае. А на пачатку фарміравання прыхільнасці да расслаблення з дапамогай псіхаактыўнага рэчыва былі ў апошняга і мараль, і сіла, і воля, і чалавечы выгляд...

Трэба разумець, што такія псіхічныя захворванні, як наркатычная ці алкагольная залежнасць, у кожным выпадку абумоўлены некалькімі прычынамі. Значэнне мае незлічоная колькасць фактараў — генетыка, выхаванне, соцыум, жыццёвыя абставіны і г.д. Грамадства, са свайго боку, можа паўплываць толькі на пэўныя з іх. Можа, напрыклад, абмежаваць час і месца продажу алкагольных напояў, прадухіліць распаўсюджванне на тэрыторыі краіны буйных партый наркотыкаў... З усім жа астатнім давядзецца разбірацца спецыялістам і зацікаўленаму ў выздараўленні пацыенту.

Галоўны нарколаг Міністэрства аховы здароўя, кандыдат медыцынскіх навук Аляксей АЛЯКСАНДРАЎ і дацэнт Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдат медыцынскіх навук Алег АЙЗБЕРГ тлумачаць, што трэба разумець залежным і тым, хто побач з імі. Словам, развенчваюць асабліва папулярныя «байкі».

1. Ёсць меркаванне, што алкагалізм і наркаманія — праблема страты маралі. Праблема тут не проста ў тым, што колішняе выгнанне д'ябла з тых, хто злоўжывае, аказалася неэфектыўным. Засілле маралізатарства ў грамадстве абавязкова правакуе ўзнікненне маральнай панікі, панічных настрояў. Частае ўжыванне ў дачыненні да тэмы алкагалізму слоў ваеннай тэрміналогіі — «барацьба», «перамаганне» — завышаюць сапраўдную пагрозу і ў рэшце рэшт выклікаюць у грамадстве нездаровую заклапочанасць.

На фоне «маральнай панікі» ў дачыненні да тых жа наркотыкаў асабліва абсурдна выглядае талерантнае стаўленне нашага грамадства да піва і больш моцных алкагольных напояў. У ідэале грамадства павінна выпрацаваць абсалютна аднолькавае адмоўнае ўспрыняцце любых псіхаактыўных рэчываў. Аддаваць перавагу некаторым з іх — значыць, па меншай меры, не дабіцца зніжэння колькасці залежных.

Дарэчы, замежныя вучоныя сёння валодаюць дакладнай інфармацыяй адносна таго, які падыход грамадства да вырашэння праблемы зніжэння шкоды ад вышэйзгаданых залежнасцяў з'яўляецца найбольш эфектыўным — маралізатарскі (аб'яўленне славеснай вайны наркотыкам і алкаголю) або ўкараненне спецыяльных праграм па зніжэнні шкоды (развіццё сеткі рэабілітацыйных цэнтраў, адкрыццё пунктаў абмену шпрыцаў, прымяненне замяшчальнай тэрапіі і інш.). Больш эфектыўным паказаў сябе падыход прагматычны — укараненне праграм па зніжэнні шкоды. Дастаткова сказаць, што менавіта такая практыка ўплывае на сур'ёзнае зніжэнне колькасці новых выпадкаў заражэння ВІЧ.

2. Ёсць меркаванне, што нарказалежныя аднойчы абавязкова становяцца на крымінальны шлях. Для таго, каб было на што набыць чарговую «дозу», даводзіцца рабаваць і нават забіваць. Аднак паводле экспертных ацэнак, у нашай краіне наркотыкі ўжывае каля 50 тысяч чалавек. Крымінальныя звесткі пры гэтым не пацвярджаюць, што ўсе гэтыя людзі ўчынілі ў сваім жыцці крадзеж ці забойства.

3. Ёсць меркаванне, што сярод іншых відаў залежнасцяў самай згубнай з'яўляецца наркатычная. Для здароўя асобнага чалавека так і ёсць, паколькі нават аднаразовае ўнутрывеннае ўвядзенне наркотыку можа стаць смяротным. А вось калі гаварыць пра здароўе грамадства, то для яго найбольшую пагрозу ўяўляе, безумоўна, тытунь (затым — алкаголь, і толькі пасля — наркотыкі). Абумоўлена гэта найперш маштабамі распаўсюджанасці пералічаных відаў залежнасцяў. Ад хвароб, звязаных з курэннем, у нас штогод гіне звыш 15 тысяч чалавек. Па прычыне ж ужывання наркотыкаў — у разы менш.

4. Ёсць меркаванне, што кожны наркаман за сваё жыццё ўцягвае ў залежнасць да 20-50 чалавек. Калі б гэта цалкам адпавядала рэальнасці, то ўсяго за некалькі дзесяцігоддзяў усе нашы грамадзяне былі б уцягнуты ва ўжыванне наркарэчываў. Больш правамерна гаварыць пра існаванне пэўных «груп рызыкі». У групе рызыкі знаходзяцца, напрыклад, людзі з абцяжаранай спадчыннасцю. Сёння вывучаецца звыш 60 генаў, якія, як мяркуецца, маюць дачыненне да фарміравання залежнасці ад псіхаактыўных рэчываў.

5. Ёсць меркаванне, што пасля так званых «лёгкіх» наркотыкаў спажывец абавязкова пераходзіць на «цяжкія». Так звычайна запалохваюць навучэнцаў старшых класаў. Аднак даволі істотная колькасць падлеткаў ведае тых, хто спрабаваў «лёгкія» псіхаактыўныя рэчывы, або самі далучаліся да гэтай справы, але пераход на больш «цяжкія» не адбыўся. Так у моладзі нараджаецца разуменне, што пад «запалохваннем» заўсёды хаваецца падман. Такім чынам узнікае недавер і да ўсёй іншай інфармацыі, якую прадастаўляюць дарослыя.

6. Ёсць меркаванне, што галоўны спосаб лячэння алкагалізму — кадзіраванне. Адзіным метадам змагання са згубнай звычкай некаторыя лічаць гіпноз, або кадзіраванне. Аднак калі пасля лячэння падобнага кшталту адбываецца зрыў, у самога залежнага і яго блізкіх узнікае негатыўнае стаўленне да ўсіх відаў урачэбнай дапамогі: маўляў, тут ужо нічога не зробіш... На самой справе гіпнатычнае ўздзеянне падыходзіць толькі людзям з асаблівым складам псіхікі, а таму «прызначыць» падобнае ўмяшанне павінен спецыяліст, а не блізкія хворага. Акрамя так званага кадзіравання, існуе даволі багаты арсенал сродкаў і магчымасцяў развіцця з залежнасцю і жыцця ў рэмісіі. Але для паспяховага выніку сам залежны павінен спачатку прызнаць сябе хворым і звярнуцца да ўрача-нарколага.

7. Ёсць меркаванне, што залежныя жанчыны значна горш за мужчын паддаюцца лячэнню. Сапраўды, вядома, што псіхаактыўныя рэчывы, у тым ліку алкагольныя напоі, інакш уздзейнічаюць на слабы пол. Пры адной і той жа дозе мужчына і жанчына аднолькавай вагі будуць па-рознаму сябе адчуваць. У арганізме жанчыны этылавы спірт засвойваецца больш павольна, і таму яна п'янее хутчэй за мужчыну. Праўда і тое, што ў жанчын крыху інакш фарміруецца і працякае залежнасць, — галоўным чынам, таму, што яны «да апошняга» імкнуцца ўтойваць ад навакольных сваё захапленне, а значыць, пазней трапляюць да спецыяліста. Аднак пакуль няма навуковых звестак адносна таго, што ў жанчын залежнасць — тая ж алкагольная — набывае больш цяжкія формы і цяжэй паддаецца лячэнню. Больш важнай будзе, матывацыя, а не палавая прыналежнасць.

Святлана БАРЫСЕНКА.

100 ІДЭЙ ДЛЯ БЕЛАРУСІ

«Разумны дом», «Школа юнага праграміста», «ІТ-атрад», «Зялёны дом»...

... — усяго 10 праектаў прадставяць студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі на Рэспубліканскі моладзевы конкурс «100 ідэй для Беларусі».

Напрыклад, студэнт 3 курса факультэта інфармацыйных тэхналогій і кіравання Станіслаў АРХІПЕНКА прапануе на конкурс праект «Разумны дом» са створанай ім аўтаматызаванай сістэмай, якая памяншае расход энергіі ў жытле і адначасова павышае ўзровень якасці пражывання. Сістэма кіруе асвятленнем, святлом, мае сімпатычны web інтэрфейс, умее сінтэзаваць мову і ўзаемадзейнічаць з сеткай GSM (адпраўляе і прымае SMS). Апроч таго, яна спалучае ў сабе відэаназіранне і серверы: мультымедыйны, імёнаў лакальнай сеткі, DHCP , DynDNS і многае іншае. З улікам эканамічнасці, надзейнасці і ўніверсальнасці сістэмы, можна спадзявацца, што яна зацікавіць рынкі Беларусі і бліжняга замежжа.

Студэнты 5 курса факультэта камп'ютарных сістэм і сетак Аляксей МАНЮК, Аляксей ЖВІРБЛІС, Дзмітрый ШЧУРУК, Ігар ЦІМАШЭНКА заявілі на конкурс праект «Школа юнага праграміста», мэта якога — выкладанне мінскім школьнікам асноў праграмавання. Варта адзначыць, што праект ужо рэалізуецца на базе БДУІР.

У праекце «Зялёны дом» студэнткі 3 курса факультэта камп'ютарных сістэм і сетак Дар'і ДАРСКОЙ рэалізуецца ідэя стварэння валанцёрскага экалагічнага атрада. Яго ўдзельнікі ўжо высаджваюць кветкі ў Батанічным садзе Нацыянальнай акадэміі навук, а ў будучыні пракладуць там новыя сцяжынкі для прагулак, зойміцца прыбіраннем смецця на алеях.

Студэнт 5 курса факультэта радыётэхнікі і электронікі Ігар БАРУШКА прадставіў на конкурс праект «ІТ-атрад». Яго мэта — навучанне карыстальнікаў-пачаткоўцаў рознага ўзросту рабоце на камп'ютары, а таксама стварэнне web-сайтаў, праектаванне аналагавых і лічбавых прыстасаванняў. «ІТ-атрад» ужо дзейнічае ў ВНУ.

Іна АРЭХАВА.

Пытальнік

Дзіцячыя кансервы хутка перастануць быць дэфіцытам. Але падаражэюць?

«Вось ужо месяц, як ва ўсіх навакольных і нават спецыялізаваных крамах зніклі дзіцячыя мясныя кансервы айчыннай вытворчасці. Паліцы, дзе стаялі гэтыя прадукты, цяпер застаўлены тушонкай і ўсякімі паштэтамі, а на ўсе роспыты, што здарылася, прадаўцы толькі разводзяць рукамі: «І самі не ведаем». Няўжо крызіс «з'еў» і гэты, такі сацыяльна значны, прадукт?»

Наталля МАЛІВУК, маці 2 дзяцей, *Слуцк.*

Пытаннем, куды зніклі мясныя кансервы, заклапаціліся не толькі многія маладыя бацькі, але таксама алергікі, якім прадпісана дыетычнае харчаванне, і нават гаспадары катоў і сабак: іх гадаванцы любяць час ад часу паласавацца тонка змолатым мяскам без усялякіх «Е». Яшчэ ўлетку рознакаляровыя бляшанкі адзінага ў Беларусі вытворцы мяснога, мяса- і рыбарасліннага дзіцячага харчавання — Аршанскага мясакансервавага камбіната — свабодна ляжалі практычна ў кожнай краме. Цяпер жа натрапіць на іх нават у спецыялізаваных магазінах — вялікая ўдача, і тыя, каму яна выпала, стараюцца закупіць пра запас адразу некалькі дзясяткаў кансерваў... Нечаканы дэфіцыт спарадзіў самыя розныя чуткі. Вось самыя распаўсюджаныя версіі, якія рэгулярна чуваць у крамах: «Завод увогуле стаў, кансервы засталіся толькі для маламаёмных, хто атрымлівае бясплатнае харчаванне», «Кашатнікі раскупілі» і «Усё вывозяць у Расію». Найбольш аптымістычны варыянт — «Вытворцы проста чакаюць, пакуль ім дазволяць падняць цану».

— Што вы так хвалюецеся? Вунь у нас поўна мясных кансерваў, — супакойвала наведвальніцаў кансультант папулярнай сеткі дзіцячых магазінаў.

— Угм, — змрочна ківалі наведвальнікі, разглядаючы шэрагі слоікаў украінскай, расійскай і еўрапейскай вытворчасці, — толькі гэтыя 100 грамаў каштуюць як мінімум 10—12 тысяч, а беларускія былі па 2—3... Будзем шукаць.

Карэспандэнты «Звязды» вырашылі не займацца разам з усімі бясплоднымі «забегамі», а спытацца наўпрост у вытворцаў, што здарылася і ці маюць чуткі пад сабой падставу.

На Аршанскім мясакансервавым заводзе паведамілі, што пэўны спад вытворчасці дзіцячых кансерваў сапраўды быў: у маі на заводзе здарыўся пажар, з-за якога пэўны час стаяў забойны цэх і рэканструявалася халадзільная ўстаноўка.

— Але зараз мы цалкам аднавілі ранейшы аб'ём вытворчасці, — падкрэсліла **намеснік генеральнага дырэктара па вытворчасці і якасці Вольга МАСАЛОВІЧ.** На асартыменце прадукцыі, паводле слоў спецыяліста, часовы прастой не адбіўся — прадпрыемства па-ранейшаму вырабляе каля 20 відаў дзіцячых мясных кансерваў. Праўда, у сувязі з тым, што ў Беларусі назіраецца сезонны дэфіцыт мяса індычкі, труса, бараніны, каніны, кансервы з гэтым мясам пакуль што не выпускаюцца, затое пабольшала ялавічыны і свініны з разнастайнымі раслінамі і мяснымі дабаўкамі. Атрымліваецца, што цяперашняя адсутнасць кансерваў у крамах — не віна прадпрыемства, а хутчэй няспрытнасць саміх крам.

— Паверце, мы цудоўна разумеем сваю адказнасць, што з'яўляемся адзіным вытворцам гэтага віду дзіцячага харчавання ў Беларусі, і таму прыкладаем усе намаганні для таго, каб дзіцячае харчаванне ў поўным аб'ёме было прадстаўлена ў гандлёвай сетцы краіны, — запэўніла Вольга Масаловіч. У айчынныя магазіны, удакладнілі «Звяздзе» ў аддзеле збыту, адгрузкі ідуць штодня, а вось доля экспарту практычна не павялічылася, так што «расійскага следу» ў дэфіцыце кансерваў шукаць не варта.

— Яшчэ адно пытанне, якое безумоўна хвалюе баць коў: як вырастуць цэны на дзіцячыя кансервы, скажам, да канца гэтага года?

— Дакладна адказаць не магу. Справа ў тым, што цана на нашу прадукцыю рэгулюецца Міністэрствам эканомікі, і самастойна мы яе павысіць не можам. Адпаведная заяўка пададзена, зараз яна разглядаецца. Мяркую, што цэны на дзіцячае харчаванне вырастуць прыкладна на 30 працэнтаў.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

7 кастрычніка

Дзве даты

1932 год — нарадзіўся (вёска Задроздзе Лагойскага раёна) Іван Пташнікаў, вядомы беларускі пісьменнік. Заслужаны работнік культуры Беларусі. З 1957 года працаваў у Дзяржаўным выдавецтве Беларусі, часопісах «Маладосць» і «Полымя». Асаблівае месца ў творчасці пісьменніка займае тэма вайны (аповесці «Тартак», «Найдорф» і інш.). Аўтар аповесці «Лонва», раманаў «Алімпіяда», «Мсціжы» і іншых. Асобныя творы экранізаваныя на беларускім тэлебачанні. Атрымалі шырокі рэзананс апавяданні «Французянкі», «Тры пуды жыта», «Пагоня». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Коласа (1978).

1910 год — тысячы жыхароў Пецярбурга прыйшлі на Каменданцкае поле, каб сваімі вачыма паглядзець на грандыёзнае авіяшоу, што праходзіла ў рамках Першага ўсерасійскай тыдня паветраплавання. І ўсе прысутныя перажылі сапраўдны шок — падчас паказальнага палёту загінуў ўсенародны любімец Леў Макаравіч Маціевіч. У большасці даведнікаў, дзе сёння згадваецца імя гэтага піянера расійскай авіяцыі, гаворыцца, што ён загінуў, выпаўшы з пашкоджанага самалёта. Але некаторыя крыніцы, спасылаючыся на шэраг сведкавых паказанняў і дакументаў, сцвярджаюць, што гэта не так. І што загадкавая гібель адважнага лётчыка звязана з імем тагачаснага прэм'ер-міністра Пятра Сталыпіна. Сталыпін з'явіўся нечакана, калі свята ўжо падыходзіла, і стаў аглядаць новы аэраплан Маціевіча. Авіятар прапанаваў прэм'еру падняцца з ім у паветра, і той пасля нядоўгага роздуму пагадзіўся. Жандар, які адказваў за бяспеку Сталыпіна, на якога ўжо было здзейснена некалькі замахаў, спрабаваў адгаварыць кіраўніка кабінета, спасылаючыся на тое, што капітан Маціевіч — вядомы член сацыял-рэвалюцыйнай ячэйкі. Але Сталыпін толькі адмахнуўся. А між тым жандар меў рацыю, і пілот сапраўды меў заданне ліквідаваць Сталыпіна. У паветры ён зачытаў прэм'еру прысуд. Але той не страціў мужнасці і аргументавана абараніў сваю палітычную лінію. Маціевіч, усумніўшыся ў правасці сваіх таварышаў, моўчкі пасадзіў самалёт, так і не ажыццявіўшы задуманае. А Сталыпін у сваю чаргу паабяцаў забыцца пра інцыдэнт. Але, прызямліўшыся, Леў Макаравіч убачыў бязлітасныя вочы сваіх паплечнікаў, якія вынеслі зараз ужо яму самому смяротны прысуд за нявыкананае заданне. Ведаючы, што «таварышы» па партыі жалю не ведаюць, адважны лётчык вырашыў сам правесці яго выкананне. Маціевіч папрасіў яшчэ адзін палёт. Яго «Фарман» зноў узняўся ў неба. І раптам усе ўбачылі, як пілот устаў на сядзенне і «рыбкай», раскінуўшы рукі, выскачыў з кабіны. Яны падалі амаль побач, лётчык і самалёт, пад крыкі адчаю і жаху. Маціевіча хаваў увесь Пецярбург. На свежы кветкавы ўзгорак на яго магіле быў пакладзены і вялікі вянок найпрыгажэйшых белых хрызантэм ад Сталыпіна.

Цытата дня

«Ніколі не разглядайце, да якой партыі належыць чалавек, які шукае ў вас праўды».

Напалеон Банапарт (1769—1821), імператар Францыі, палкаводзец.

ОДО «ЭкоФуд Плюс» (Минская область, г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 143/405) ликвидируется. Претензии принимаются в течение двух месяцев по тел. 8025 9834736 или по адресу: г. Молодечно, ул. Ф. Скорины, 2/32.

УНН 690640339

Утерянный бланк строгой отчетности 2РН «Страховой полис добровольного страхования от несчастных случаев и заболеваний» серии БН, в количестве 1 штуки № 0823029 Представительства Белгосстраха по Борисовскому району считать недействительным.

УНП 600013344

г. ВИТЕБСК **19.10.2011**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ НА АУКЦИОНЕ С ПРИМЕНЕНИЕМ В ХОДЕ ТОРГОВ МЕТОДА ПОНИЖЕНИЯ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПРОДАЖИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей	Минимальная цена продажи предмета аукциона, рублей	Сумма задатка за участие в торгах, рублей
4.	Здание бывшего пункта централизованного наблюдения, расположенное по адресу: Витебская обл., Миорский р-н, г. Дисна, ул. Советская, 10, и право заключения договора аренды земельного участка.	Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инв. № 211/С-8654 (здание неустановленного назначения – пункт централизованного наблюдения), одноэтажное кирпичное, 1987 г. постройки, общая площадь 36,7 кв.м, объем 152 куб.м, фундамент б/бетонный, перекрытие ж/бетонное, крыша а/волнистая. Земельный участок с кадастровым номером 223351000001000037, площадь 0,0133 га для размещения административного здания, срок аренды 50 лет.	14 413 044	3 609 009	7 447 690
5.	Здание административно-хозяйственное с колодцем и асфальтобетонным покрытием и сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, расположенные по адресу: Витебская область, Бешенковичский район, г.п. Бешенковичи, ул. Володарского, 49, и право заключения договора аренды земельного участка.	Характеристика объектов недвижимости: - капитальное строение с инвентарным номером 231/С-8416 – одноэтажное бревенчатое здание, фундамент бутовый, перекрытия деревянные утепленные, крыша шиферная, общая площадь 128,9 кв.м, 1988 г. постройки; пристройка кирпичная; холодная пристройка кирпичная; колодец, ж/б кольца; дворовое покрытие – асфальт, общая площадь 776 кв.м; - капитальное строение с инвентарным номером 231/С-8415 – одноэтажное кирпичное здание, фундамент бутовый, перекрытия железобетонные, крыша шиферная, общая площадь 75,4 кв.м, 1988 г. постройки. Земельный участок: площадью 0,1468 га для обслуживания административного здания и построек, кадастровый номер 220555100001001826, срок аренды – 55 лет. Ограничения в использовании земельного участка – охранная зона линии электропередачи напряжением свыше 1000 В, площадью 0,0230 га, охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В, площадью 0,0096 га. Использование – для обслуживания административного здания и построек.	83 955 653	26 039 173	
6.	Здание магазина, расположенное по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, г. Городок, ул. Вокзальная, 40а, и право заключения договора аренды земельного участка.	Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 201/С-11334 – здание специализированное розничной торговли (магазин) – одноэтажное кирпичное здание 1974 г. постройки, общей площадью 457,2 кв.м, фундамент бетонный, перекрытия – ж/б плиты; крыша рулонная, с кирпичным тамбуром, двумя кирпичными сходами в подвал, железобетонным подвалом и асфальтобетонным покрытием. Земельный участок площадью 0,0625 га, сроком аренды 50 лет, кадастровый номер 221850100001003220, для размещения объектов розничной торговли. Ограничение в использовании всего участка в связи с нахождением в водоохранной зоне реки, а также охранная зона линии электропередач напряжением до 1000 В на площади 0,0026 га.	111 493 170	32 643 288	
7.	Здание фельдшерско-акушерского пункта, расположенное по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, г. Городок, ул. Вокзальная, 53, и право заключения договора аренды земельного участка.	Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 201/С-11373 – здание специализированное здравоохранения и предоставления социальных услуг (здание фельдшерско-акушерского пункта) – одноэтажное бревенчатое здание 1949 г. постройки, общей площадью 105,4 кв.м, фундамент бутобетонный, перекрытия деревянные, крыша шиферная, с двумя холодными кирпичными пристройками, дощатым сараем, забором деревянным, двумя калитками, уборной. Земельный участок площадью 0,1126 га, кадастровый номер 221850100001003221, срок аренды участка – 50 лет, для размещения объектов здравоохранения и предоставления социальных услуг. Охранная зона линии электропередач напряжением до 1000 В на площади 0,0204 га.	64 998 342	23 093 493	

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон/факс в г. Витебск: (0212) 476096, сайты www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail: votfondgi@tut.by.

Аукцион состоится **19 октября 2011 г.** в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.

